І. Н. КОЛАБАВА

# УНІКАЛЬНЫ ПАМЯТНЫ МЕДАЛЬ З ФАЛЕРЫСТЫЧНАЙ КАЛЕКЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА МУЗЕЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Ідэя стварэння музея беларускай гісторыі ўпершыню была рэалізавана пры заснаванні ў 1855 г. Віленскага музея старажытнасцей. Працягам гэтага працэса ў першай палове XX ст. было паралельнае існаванне двух цэнтраў беларускай гісторыі і культуры – Беларускага дзяржаўнага музея (1923) у Мінску і Беларускага музея імя І. Луцкевіча (1921) у Вільні.

Ініцыятарам стварэння Беларускага музея ў Вільні стаў Іван Луцкевіч (1881–1919) – адзін з пачынальнікаў беларускага нацыянальнага руху, археолаг, краязнавец, збіральнік помнікаў даўніны (мал. 1, 2; уклейка).

У прыватную калекцыю І. Луцкевіча ўваходзілі археалагічныя, нумізматычныя, сфрагістычныя, этнаграфічныя, пісьмовыя помнікі, мастацкія творы і інш. У 1921 г. на аснове гэтага збору Радай Беларускага навуковага таварыства быў заснаваны Беларускі музей імя І. Луцкевіча. Экспазіцыя музея адлюстроўвала гісторыю і культуру Беларусі. Музейныя фонды ў 1939 г. складалі 13 450 адзінак захоўвання [1, с. 25].

Музей працягваў сваю працу і ў гады ІІ Сусветнай вайны. У 1944 г. было прынята рашэнне аб яго закрыцці і размеркаванні фондаў паміж музейнымі, бібліятэчнымі ўстановамі Беларусі і Літвы.

У гэты перыяд ішоў актыўны працэс фарміравання фондаў Беларускага дзяржаўнага музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне дзейнасці Беларускага дзяржаўнага музея распачалося толькі ў 1956 г. з стварэння Арганізацыйнай групы гісторыка-краязнаўчага музея (з 1964 – Дзяржаўны музей БССР). Таму частка калекцый віленскага Беларускага музея апынулася на часовым захаванні менавіта ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Уліковыя дакументы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь сведчаць, што ў 1962 г. у фонды Арганізацыйнай групы з музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны было

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перададзена, напрыклад, 210 (па акту – 209) экзэмпляраў пячатак і штампаў з фондаў былога Беларускага музея ў Вільні[1].

Фалерыстычную калекцыю музея папоўніў унікальны экспанат, непасрэдна звязаны з Іванам Луцкевічам, – памятны срэбны медаль на яго хрышчэнне.

У акце выдачы № 2016 ад 26.03.1965 г. Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Дзяржаўнаму музею БССР пад № 58 значыцца «медаль серебряная, крещения Ивана Луцкевича»[2].

Медаль (інв. № 17864; Др. 428. Кн. 7) выкананы з срэбра, маса – 33 г, дыяметр – 4,5 см.

На аверсе медаля біблейскі сюжэт хрышчэння Ісуса Хрыста і легенда – JEDEN BOG, JEDNA WIARA, JEDEN CHRZEST (Адзін Бог, адна вера, адно хрышчэнне)

На рэверсе медаля ў атачэнні дэкаратыўных элементаў легенда – NA PAMIĄTKĘ / CHRZTU / *DLY / IANA GERMANA / LUCKIEWICZA / U OD: D: 28/5 1881 / OD / M. P.* (На памяць / хрышчэння / дзеля / Яна Германа / Луцкевіча / н[арожданага] ад д[ня] 28/5 1881 / ад / М. П. (мал. 3, 4, 5, 6).

Выданне касцёлам такіх медалёў пры хрышчэнні было ў другой палове XIX ст. шырока распаўсюджанай традыцыяй (мал. 7, 8, 9).

У 1996 г. у Нацыянальным музее гісторыі і культуры Беларусі пры ўдзеле некаторых іншых беларускіх музеяў адкрылася юбілейная выстава ў гонар 115-годдзя са дня нараджэння І. Луцэвіча і 75-годдзя з часу заснавання Беларускага музея. У двух экспазіцыйных залах была прадстаўлена гісторыя музея і прадметы з яго збораў – археалагічныя матэрыялы, пячаткі, кераміка, карціны беларускіх мастакоў першай паловы XX ст., скульптура, абразы XVII – пачатку XX, культавыя рэчы, разьба па дрэву, музычныя інструменты, тэатральныя афішы, падборка пісьмовых помнікаў і фотаздымкаў.

Дзейнасць Беларускага дзяржаўнага музея ў Мінску і Беларускага музея ў Вільні, што разгортвалася на фоне бурлівых гістарычных падзей першай паловы XX ст., – яскравы прыклад

[1] Акт выдачи № 552 от 4.11.1962 г. Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны.

[2] Акт выдачи № 2016 от 26.03.1965 г. Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалізацыі розных і вельмі складаных шляхоў стварэння музеяў беларускай гісторыі.

1. *Гужалоўскі, А. А.* Уступны артыкул / А. А. Гужалоўскі // Музеі Беларусі : даведачнае выданне. – Мінск, 2008. – С. 3–56.

2. Іван Луцкевіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: be–tarask.wikipedia.org. – Дата доступу: 22.03.2016.

3. Medal na pamiątkę chrzte [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: yandex.by/images>. – Дата доступу: 22.03.2016.

К. Ф. ЛЫСАК

## ЭТНАКУЛЬТУРНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ ПРАДСТАЎНІКОЎ РОДУ ТЫШКЕВІЧАЎ

Нацыя нарадзілася ў выніку мадэрнізацыйных працэсаў XIX–XX стст. Істотнымі для разумення адметнасцей нацыянальнай ідэнтычнасці з’яўляюцца яе папярэднія этнакультурныя формы. Багатая гісторыка-культурная спадчына беларускіх зямель дазваляе прасачыць змяненне яе зместу на прыкладзе выдатных прадстаўнікоў шляхецкіх радоў, якія зрабілі значны ўклад у палітычнае, культурнае і эканамічнае жыццё Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай Імперыі, Польшчы, Літвы і Беларусі.

Сярод даследчыкаў няма адзінага меркавання адносна вызначэння паняцця нацыі. Прыхільнікі прымордыялісцкага падыходу, сярод якіх І. Г. Гердэр, І. Г. Фіхтэ і больш познія Л. М. Гумілёў, Ю. В. Брамлей, пастулююць эвалюцыяністкі характар развіцця этнасу, а нацыю лагічнай, больш дасканалай ступенню яго развіцця. На другім полюсе знаходзяцца канструктывісты (Э. Гелнер, Б. Андэрсан), якія звязваюць з’яўленне сучасных нацый, у першую чаргу, са зменамі ў палітыка-эканамічным становішчы еўрапейскіх і амерыканскіх краін у XVIII–XIX стст., пры гэтым асабліва падкрэсліваецца роля індустрыялізацыі. Некаторыя даследчыкі, пагаджаючыся з сучасным характарам нацый, звяртаюць увагу на ролю папярэдніх этнічных, лакальных і рэлігійных ідэнтычнасцей у фарміраванні нацыі [2, с. 12–13].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ